Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Работніца і калгасніца Беларусі

Бібліятэка БССР

УСЕНАРОДНАЕ ТАРЖАСТВО

5 снежня 1937 г.—слаўная гадавіна зацверджання Вялікай Сталінскай Канстытуцыі—асноўнага закона першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы.

Радасцю і лікаваннем совецкі народ адзначае першую гадавіну шчаслівага свята—дзень Канстытуцыі СССР. Усенародным святам стаў гэты дзень для ўсіх працоўных нашай краіны.

Сталінская Канстытуцыя ўвайшла ў жыццё, як новы комуністычны маніфест, які працягвае пламенную пропаведзь і вялікія справы Маркса—Энгельса—Леніна. Геніяльны правадыр новага чалавецтва тав. Сталін ператварыў у жыццё іх вялікія заветы. Ён тварэц, ініцыятар новай Канстытуцыі.

Многамільённы совецкі народ назваў Канстытуцыю імем, якое з любоўю вымаўляецца працоўнымі ўсяго света на ўсіх мовах—імем вялікага Сталіна.

У Канстытуцыі вогненнымі літарамі запісана тое, аб чым вякамі марылі працоўныя, эксплаатыруемыя народы, запісана тое, што заваявана ў нас у СССР пад кіраўніцтвам нашай слаўнай і непераможнай большэвіцкай партыі і таварыша Сталіна.

У Совецкім Саюзе ўся ўлада належыць працоўным горада і вёскі; фабрыкі і заводы, зямля, яе нетры, навука, мастацтва—усё гэта з'яўляецца народным дастаяннем. У СССР ліквідавана прыватная ўласнасць—аснова эксплаатацыі і прыгнечання працоўных мас.

У запісаных Канстытуцыяй правах народаў, правах чалавека і грамадзяніна соцыялістычнай краіны ярка і наглядна бачны асаблівасці Совецкай краіны, так супроцьлеглай па свайму характару краінам капіталізма—краінам эксплаатацыі і наёмнага рабства.

Сталінская Канстытуцыя—самая дэмакратычная Канстытуцыя ў свеце. Ні ў якое параўнанне нельга паставіць нашу Канстытуцыю, Канстытуцыю свабоднага народа з канстытуцыямі буржуазных краін.

У самых дэмакратычных буржуазных краінах існуюць розныя абмежаванні, якія ідуць на карысць багатых. Існуе цэнз аседласці, па якому трэба пражыць на адным месцы некалькі год, каб атрымаць права голаса.

Існуюць абмежаванні па нацыянальна-расаваму прызнаку. Па гэтаму прызнаку ў Амерыцы амаль усе негры пазбаўлены права голаса.

Існуюць абмежаванні і ў адносінах жанчын, якія не маюць права голаса ў многіх капіталістычных краінах.

Пералік абмежаванняў можна было-б далёка прадоўжыць. Але хопіць і гэтых, каб упэўніцца, што буржуазная дэмакратыя—гэта дэмакратыя на словах, на паперы.

З вялікай радасцю святкуе дзень 5 снежня беларускі народ. Урачыстасць гэта асабліва вялікая для народа, які толькі пры совецкай уладзе атрымаў сваю дзяржаўнасць.

Толькі пад кіраўніцтвам гераічнай партыі Леніна—Сталіна, пры дапамозе вялікай сям'і народаў СССР і рускага пролетарыята адрадзіўся беларускі народ. Няўхільнае ажыццяўленне мудрай Ленінска-Сталінскай нацыянальнай палітыкі ператварыла Беларусь—былую калонію царскага самаўладства—у квітнеючую індустрыяльна-калгасную ордэнаносную Рэспубліку.

Родным бацькам і арганізатарам беларускай дзяржаўнасці з'яўляецца вялікі геній чалавецтва—наш родны Сталін. Беларускі народ ніколі не забудзе бацькоўскай любві і клопатаў мудрага Сталіна!

Праклятыя фашысцкія сабакі, трацкісцка-зіноўеўска-бухарынска-рыкаўскія бандыты прыкладалі ўсе сілы, каб зноў закабаліць Совецкую Беларусь. Шкодніцтвам, шпіёнствам, дыверсіямі лютыя ворагі хацелі адабраць у беларускага народа вялікія заваёвы, хацелі ізноў ускласці на яго шыю ярмо капіталістычнай эксплаатацыі і кулацкай кабалы.

Але ніколі не ўдасца ім гэтага ажыццявіць! Беларускі народ, выкрываючы, громячы лютых ворагаў народа, мацаваў і мацуе сваю сувязь з народамі СССР. І таму няма такой сілы, якая-б магла разарваць гэтую сувязь, няма такой сілы, якая-б магла адарваць БССР ад вялікага Саюза Соцыялістычных Рэспублік.

Упершыню ў гісторыі чалавецтва мільёны грамадзян першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян будуць выбіраць свой вярхоўны орган на аснове Сталінскай Канстытуцыі, якая прадастаўляе народам нашай краіны агульныя, роўныя выбарчыя правы на аснове прамога і тайнага галасавання.

Выбарчая кампанія ўступіла у самы важнейшы этап. З палкім аднадушшам совецкі народ называў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР сваіх лепшых людзей, доблесных патрыётаў радзімы, непахісных барацьбітоў за соцыялізм.

Увесь ход выбарчай кампаніі паказаў, як глыбока любоў і адданасць народных мас да комуністычнай партыі, да яе правадыра, тварца новай Канстытуцыі—Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Імя любімага правадыра працоўных нашай краіны і ўсяго света—таварыша Сталіна было першым імем, названым у кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета.

Імёны яго слаўных саратнікаў—тт. Молатава, Варашылава, Кагановіча, Калініна, Мікаяна, Ежова, Андрэева, Чубара, Касіора, Жданава—былі самымі папулярнымі імёнамі на ўсіх сходах працоўных.

Вялікі гонар аказан беларускаму народу тым, што па Менскай выбарчай акрузе будзе балатыравацца Клімент Ефрэмавіч Варашылаў.

Беларускі народ шчасліў тым, што 12 снежня выбаршчыкі Менска свае галасы аддадуць за бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна, за жалезнага наркома абароны—першага маршала Совецкага Саюза.

Да выбарчых урнаў совецкі народ прыдзе згуртаваным і яшчэ больш аб'яднаным вакол партыі Леніна—Сталіна, натхнёны адзінай рашымасцю абраць у Вярхоўны Совет самых лепшых, самых адданых справе барацьбы за комунізм людзей.

Сто дваццаць пяць тысяч працоўных Сталінскай выбарчай акругі г. Масквы пісалі ў сваім пісьме да тав. Сталіна: „Галасуючы за Вас, таварыш Сталін, мы галасуем за шчаслівае, свабоднае, радаснае, заможнае жыццё мільёнаў нашай вялікай радзімы, мы галасуем за яшчэ больш выдатную будучыню краіны Советаў".

Гэтыя словы выбаршчыкаў паўтарае ўвесь совецкі народ, адзіны ў сваёй любві і давер'і да Ленінска-Сталінскай партыі, да яе Сталінскага ЦК.

Нашкандыдат таварыш Варашылаў



Няхай жыве Клім Варашылаў!

Кліменцій Варашылаў — наш кандыдат. Мы будзем за яго галасаваць, выбіраць у Вярхоўны Совет. Клім Варашылаў—лепшы саратнік любімага Сталіна. Я многа разоў бачыла і слухала выступленні нашага дарагога наркома—друга беларускага народу таварыша Варашылава.

Хто ў Беларусі не ведае Варашылава? З малага да вялікага кожны ведае адданага справе Леніна—Сталіна, цвёрдакаменнага большэвіка—наркома абароны.

На сходзе хатніх гаспадынь Сталінскага раёну нам расказвалі, што прэзрэнныя ворагі народу трацкісты і зіноўеўцы рыхтавалі тэрарыстычны акт, напад на нашага любімага друга—Варашылава. Кроў застыла ў жылах, калі пачулі аб гэтым. Не жыць ворагам народу! Мы, усе працоўныя, сваімі грудзьмі будзем абараняць нашых любімых правадыроў ад усякай бандыцкай сволачы.

За Кліма Варашылава будуць галасаваць усе працоўныя Менску, гэта я ведаю добра. За Варашылава я з вялікім гонарам аддам свой голас.

Я—хатняя гаспадыня, дачка беднага шаўца, які не мог мне даць адукацыю. Я выйшла замуж непісьменнай і цёмнай.

Цяпер я ўжо добра чытаю, пішу і лічу. Я вучылася ў школе для дарослых. Гэтага я змагла дасягнуць толькі ў Совецкай краіне.

Мой муж рабочы—машыніст у друкарні. Ён стаханавец. Чатырнаццацігадовы сын вучыцца ў 7 класе—выдатнік. Жывем так, як ніколі сабе не ўяўлялі. Жывем так, як жывуць рабочыя толькі ў нашай дарагой радзіме—добра, весела, заможна.

Палажэнне аб выбарах я прапрацавала добра, Канстытуцыю ведаю. Чакаю той хвіліны, калі я сваёй рукой, падачай голаса змагу выказаць тую падзяку і любоў нашым правадырам за шчаслівае жыццё, за абарону нас ад усялякіх ворагаў, якія жадаюць нам вярнуць старое.

Хай жыве наш любімы кандыдат Клім Варашылаў!

Тамара Маркаўна Грынберг.

Менск

За любімага наркома

Са слязамі радасці на вачах я прачытала ў газеце вестку аб тым, што наш дарагі Варашылаў даў згоду балатыравацца ў нас, у Менску.

Які мы заслужылі гонар, якая гордасць, з якой радасцю я падам голас за любімага наркома.

Я—былая батрачка, непісьменная ў царскі час, буду падаваць свой голас разам з усімі працоўнымі за лепшых людзей краіны.

Гэты гонар натхняе мяне на вялікія справы. Да гэтай пары я выконвала план на 170—180 проц. Цяпер я яшчэ больш узніму сваю прадукцыйнасць.

На фабрыцы я стала пісьменнай. Вучуся ў вячэрняй агульна-адукацыйнай школе.

Жыву ў поўным дастатку і радасці.

Чакаю таго моманту, каб свой голас аддаць за дарагога, любімага Варашылава.

Юзэфа Нікадзімаўна Кудак.

Менск, галантарэйная фабрыка

Аддадзім свае галасы лепшаму саратніку таварыша Сталіна— Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву!

ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

ПРЫВЕТ ТАБЕ, НАРКОМ ЛЮБІМЫ!

Сягоння нашы галасы
Звіняць над яснаю радзімай:
— Прывет табе, народа сын!
Прывет табе, нарком любімы!
Луганскі слесар, камандарм,
Ішоў тайгой,
Уралам,
Крымам.
І ўсюды ты перамагаў—
Бясстрашны, слаўны і любімы.
Праз беларускія палі
Імчаўся у бітвах векапомных,
І сёння польскія паны
Дрыжаць, як пра цябе
ўспомняць.

Рыхтуюць ворагі вайну,
Але гатовы мы да бою.
Па слову першаму твайму
Мы дружна возьмемся за
зброю.
Мы не здамо сваіх граніц,
Яшчэ вышэй свой сцяг узнімем.
Дазор наш моцны, як граніт,
Як ты, наш дэпутат любімы!
Арлом ляціць праз цэлы свет
Шчаслівы спеў маёй радзімы,
Табе—наш голас і прывет,
Саратнік Сталіна, любімы!

13/XI-37 г. г. Менск

Я. КОЛАС

ПЕРАДВЫБАРЧАЕ

Паважна так і ўрачыста
Гамонка сялянскіх бясед.
Сышліся на сход усе чыста,
Каб выбраць Вярхоўны Совет.

Вялікая-ж гэта падзея—
Ёй сведкай не быў яшчэ свет:
То новая зорка ірдзее
І свеціць на тысячы лет.

У Сталінскім мудрым законе
Дзівосныя мары жывуць,
Што праўдаю сталі сягоння,
Што к шчасцю народы завуць.

Разбіты старыя скрыжалі,
Адвечнае знішчана зло.
Шырокаю сонечнай хваляй
Разліта навукі святло.

Прароблена свету на дзіва
Работа за дваццаць гадоў:
Узораны новыя нівы,
Гмах новых шуміць гарадоў.

Праз немарач, дзебры і скалы,
Дарогі—палотны ляглі,
І носяць паслушна каналы
З калгасным дабром караблі.

Прарэзаны нетры і горы,
Парушан іх сон і спакой,
І вынікла новае мора,
Пакорнае волі людской.

І наперакор перашкодам,
Стыхійную сілу зямлі
На службу совецкім народам
У моцныя рукі ўзялі.

Нам служаць надземныя высі,
Прастор ледзяных далячынь,
І морам садоў разліліся
Бясплодныя гоні пустынь.

З галечы, з руін, спусташэння,
Як волат, падняўся народ—
Нястрымная воля імкнення,
Нябачаны творчы палёт.

І гэта гранітная воля
Свой гарт набыла ў барацьбе,
Дзе першая слаўная роля
Належыць, наш гені, табе.

І лепшых людзей і герояў,
Такіх выхаванцаў, наш цвет,
Мы дружна і з шчырай душою
Пашлем у Вярхоўны Совет.

Вялікі гонар

Радасныя дні перажываюць працоўныя Совецкай Беларусі. Клімент Ефрэмавіч Варашылаў—лепшы саратнік таварыша Сталіна, жалезны палкаводзец нашай доблеснай Чырвонай Арміі—даў сваю згоду балатыравацца дэпутатам у Совет Саюза па Менскай гарадской выбарчай акрузе. Я разам з усімі выбаршчыкамі горада Менска радуюся гэтай вялікай падзеі.

Мы ведаем таварыша Варашылава, як старага большэвіка, які яшчэ ў гады царызма змагаўся разам з Леніным і Сталіным за лепшую будучыню працоўных. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна мы гэтага светлага жыцця дасягнулі.

Беларускі народ ведае таварыша Варашылава як лепшага друга беларускага народа. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна і Клімента Ефрэмавіча Варашылава наша доблесная Чырвоная Армія ачысціла беларускую зямлю ад нямецкіх і белапольскіх акупантаў.

Я стаханаўка—глазіроўшчыца шакаладных цукерак. Да дня выбараў я абавязуюся выконваць сістэматычна план на 200 проц. і выпускаць прадукцыю толькі першага гатунку. Мы глыбока прапрацавалі „Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР“ і Сталінскую Канстытуцыю. Мая пяцідзесяціпяцігадовая маці таксама з вялікай радасцю і энтузіязмам вывучала гэтыя знамянальныя палітычныя дакументы. Яна таксама вельмі шчаслівая, што зможа аддаць свой голас лепшаму сыну совецкай радзімы—Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву.

Маня Іваноўская—стаханаўка шакаладнага цэха

Менск, фабрыка „Комунарка“.

З ДВАНАЦЦАЦІ ПЕСЕНЬ

пра нашу непераможную Чырвоную Армію, пра яе творца і натхняльніка вялікага Сталіна, пра яе палкаводца Кліmента Варашылава

II.

Яшчэ не зацiхлі над плошчаю
маршы,—
Пранеслася песня, падобная
грому,
Як вырас з луганскага слёсара
маршал,
Як стаў ён любімым жалезным
наркомам.

Быў слесар луганскі,
А сталь ён каваў,
І песні—вяснянкі
Пра волю спяваў.

І слухалі песню
Заводы і бор,
Імчаў яе вецер,
Адносіў віхор.

Іскрыліся ў горне
Агніста вуглі,
А іскры далёка
Ляцець не маглі.

Біў молат магутна,
Як гора, як гнеў,
Кавадла звінела
І молат звінеў.

І кузня звінела,
І слухала даль...
І выкаваў волю,
Як іскру, як сталь.

IX.

Ліецца гаворка ў бяседзе
калгаснай—
Здарэнні, падзеі, прыгоды,
ўспаміны...
Шчаслівая-ж маці з усмешкаю
яснай
Гаворыць пра любага, слаўнага
сына.

Спаць малога палажыла,
Неспакойны сын не спіць:
„Раскажы, як Варашылаў
Бёў рабочых панства біць?“.
Заспявала калыханку,
Як збіраўся рад у рад
За ракою, за Луганкай,
Варашылаўскі атрад.

Выціралі ўпотай слёзы
Непаслушныя жанкі,
Камандзір—луганскі слёсар
Аглядаў браневікі.
Добра помніць Дубавязка,
Як, пакінуўшы майдан,
Уцякалі немцы ў касках
Ад луганскіх партызан;
Як нязломнаю калонай,
Пад шрапнельны свіст і звон,
Варашылаў і Будзённы
Вялі войска цераз Дон.

Беларускія загоны,
Не забудуцца й яны,
Як ад шабель Першай Коннай
Беглі польскія паны.

Слава нашага наркома
Прагрымела з краю ў край...
Будзь-жа й ты, сынок, свядомы,
Нам на радасць падрастай.

Будзь адважным, мужным
сынам,
Падрастай на ўцеху ўсім,
Беражы сваю краіну,
Як луганскі слесар Клім.

XI.

Дзяўчаты з байцамі пусціліся
ў скокі
(Віхор гімнасцёрак і кофтачак
сініх!)
На прызьбе зенітчык, чарнявы,
высокі,
Гаворыць з запалам прыгожай
дзяўчыне:

Ды скажу табе я, мілай,
Быў дзянёк, ды няштодзенны:
Сам таварыш Варашылаў
Прынімаў парад ваенны.

Нявысокі сабе ростам,
Не высокі і не нізкі,
А такі вясёлы, просты,
А такі прыветны, блізкі!

А свой погляд, свой юначы,
Калі кіне, бы зарніца—
Сэрца з радасцю заскача,
Кроў адвагай забурліцца.

Адным словам, свой брат родны,
Так і хочаш, мая Каця,
Быць яго дастойным, годным,
За яго жыццё аддаці.

Конь пад ім, прост,
вярнігоры!
А як скача, як гарцуе!
Ён вачыма лічыць зоры,
Ён вушамі вайну чуе.
Вайну чуе, броў не хмура,
Толькі бліскаюць падкоўкі,
Бо яздок на ім, што бура,
З віхрам пойдзе ў перагонкі.

У міжбур'е з ім жыць міла,
Лёгка-ж будзе і ў паходзе.
Во, які наш Варашылаў!
Во, які наш палкаводзец!

XII.

За маршалам нашым, за нашым
наркомам
Мы пойдзем з'яднанаю сілай
заўсёды.
Вы чуеце—гулкі, раскацісты
гоман?
Вы чуеце—крочаць юнацкія
годы?

На кліч роднай партыі
цвёрда,
З уздымам
ідзе маладосць нашай гордай
Радзімы.
Ідзе маладосць нашай шыры
З'яднанца
У грозную армію міру
І працы.
Ім сцежкаю сцелюцца кветкі
Вяснянкі,
Вітаць іх выходзяць танкеткі
І танкі.
І строй самалётаў высоты
Займае,
І сонца, як дыск кулямёта,
Усплывае.
Іх пільныя вочы—дазоры
Граніцы.
Ім здрадная цемень, як вораг,
Скарыцца.
І пройдзе іх слава заўсёды
Над светам.
Жывіце спакойна, народы
Советаў!

* * *

Падымем-жа чаркі сям'ёю
народаў
За армію нашу, за грозную сілу,
За маршала нашых геройскіх
паходаў—
Хай доўгія годы жыве
Варашылаў!
Падымем-жа чаркі за партыю
нашу,
Што нас прывяла да здабыткаў
вялізных,
За мудры ЦК, баявы і
бясстрашны,—
Хай славіцца Ленінскі штаб
большэвізма!
Падымем-жа самыя поўныя чаркі
За вобраз, раскрыўшы нам
светлыя далі,
За слаўнае імя, за геній наш
яркі,—
Хай славіцца Сталін!

— Няхай жыве Сталін!

Выступленне кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза тав. О. Е. Багачовай

НА ПРАДВЫБАРЧЫМ СХОДЗЕ 7 ВЫБАРЧАГА ЎЧАСТКА ВІЦЕБСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

Таварышы! Перш за ўсё я выношу сваю гарачую падзяку за аказаны мне вялікі гонар. Гэта давер'е, якое вы мне аказваеце, я адношу не толькі да сябе, але, у першую чаргу, да вялікай Комуністычнай партыі, да роднага Сталіна *(бурныя апладысменты)*, якія вырасцілі нас, партыйных і непартыйных большэвікоў, далі нам жыццё, поўнае радасці і шчасця.

З небывалым натхненнем і энтузіязмам працоўныя нашай квітнеючай радзімы аднадушна першым кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР вылучылі вялікага правадыра народаў таварыша **Сталіна**. (*Бурныя апладысменты).* Гэтым самым шчаслівы совецкі народ выказаў сваю бязмежную адданасць таварышу **Сталіну**, гарачую любоў да сваёй радзімы.

Таварышы, якой прыгожай, непазнавальнай стала наша родная краіна! Нам не трэба далёка хадзіць за прыкладамі. Бярыце нашу Маркаўшчыну. Чым яна была калісьці і чым яна стала пры совецкай уладзе? Манастыр і пустыр—так віцебскія старажылы называлі старую Маркаўшчыну. Такой яна былаі на самой справе. На ўсёй тэрыторыі Маркаўшчыны адзіным прадпрыемствам у царскі час была наша ільнапрадзільная фабрыка „Дзвіна", дзе праца работніц была кабалой, горам і няшчасцем. Совецкая ўлада ператварыла Маркаўшчыну ў квітнеючы рабочы горад. Замест смеццевых звалак выраслі такія гіганты-прыгажуны, дзецішчы сталінскіх пяцігодак, як фабрыка імя КІМ, маслазавод, прасторыя шматпавярховыя дамы рабочых, сталінскія школы, клубы, дзіцячыя сады, яслі. Праца стала справай гонару, славы, доблесці і геройства.

Непазнавальнымі сталі і людзі старой Маркаўшчыны, цяперашняй Пролетарскай Слабады. Працуючы на сябе, на сваю соцыялістычную дзяржаву, сотні і тысячы стаханаўцаў і ўдарнікаў паказваюць высокую прадукцыйнасць працы, сталі знатнымі людзьмі.

Наш раён — толькі маленькі куток нашай велізарнай, багатай, квітнеючай краіны. Перамогі нашай радзімы—каласальныя. Яны залатымі літарамі запісаны ў нашай Сталінскай Канстытуцыі. Гэтыя перамогі нядаўна ўвесь наш шчаслівы со-

вецкі народ дэманстраваў у дзень XX гадавіны Кастрычніка.

З таго часу, як мяне вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета, мне часта прыходзіцца выступаць перад выбаршчыкамі, расказваць пра сябе. Мне пры гэтым бывае часценька нялоўка. Я такая-ж работніца, такая-ж стаханаўка, якіх шмат у нашай краіне, якім адкрыла дарогу ў жыццё совецкая ўлада і наша партыя.

Мне 25 год. Нарадзілася я ў вёсцы Мурожніцы, Сіроцінскага раёна, у сям'і селяніна-бедняка. Да рэволюцыі ў бацькі не было ні зямлі, ні каня, ні каровы. Батрачылі, сядзелі ўпрогаладзь. Толькі пасля Кастрычніка наша сям'я атрымала зямлю, завяліся карова і конь. Але, жывучы на аднаасобнай гаспадарцы, цяжка было пракарміцца. Каб звесці канцы з канцамі, даводзілася хадзіць на заработкі да вясковых багацеяў. Я пасвіла кароў і авечак, служыла за няньку.

У 1929 г. я паступіла на фабрыку імя Кагановіча. Тут мяне навучылі грамаце, вывелі, што называецца, у людзі. Авалодаўшы тэхнікай машын, старанна працуючы на здыманні пражы, я потым навучылася кваліфікацыі ватэршчыцы.

Калі разгарнуўся стаханаўскі рух, я адна з першых перайшла працаваць на дзве старонкі. Сёння я ўжо з'яўляюся камандзірам вытворчасці, працую брыгадзірам ватэрнага цэха. Мая мара—стаць інжынерам прадзільнае справы. Я таксама прымаю актыўны ўдзел у грамадскім жыцці фабрыкі. Тайным галасаваннем выбрана старшынёй цэхавага камітэта.

Таварышы! Некалькі дзён таму назад я была ў сябе на радзіме—у вёсцы Мурожніцы. Зараз там вялікі заможны калгас „Бязбожнік". У гэтым калгасе знайшла сабе шчаслівае жыццё мая маці. На развітанне маці мне сказала:

— Глядзі, Ольга, калі выбярэ цябе народ у вышэйшую ўладу, працуй выдатна, не зняслаў ні сябе, ні мяне.

І я вам сёння хачу сказаць, таварышы выбаршчыкі, як адказала я сваёй мацеры:

— Буду працаваць так, як вучыць нас таварыш **Сталін** *(апладысменты).* Буду чэснаі аддана служыць нашай радзіме, бязлітасна змагацца з ворагамі народа, якія мараць адняць у нас наша шчасце.

Няхай доўгія годы, у добрым здароўі жыве наш бацька, друг і настаўнік, наш родны **Сталін**—першы кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Саюза ССР! *(бурныя апладысменты. Уся зала, стоячы, наладжвае бурную авацыю таварышу* **Сталіну**).

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР,

ЗАРЭГІСТРАВАНЫЯ АКРУГОВЫМІ ВЫБАРЧЫМІ КАМІСІЯМІ ПА ВЫБАРАХ Ў СОВЕТ САЮЗА ПА ВЫБАРЧЫХ АКРУГАХ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Кулік Грыгорый Іванавіч—1890 года нараджэння, член ВКП(б) з 1917 года, камандарм другога ранга. (Рэчыцкая выбарчая акруга).



Наталевіч Нікіфар Якаўлевіч—1900 года нараджэння, член ВКП(б) з 1922 года, зараз выконваючы абавязкі старшыні ЦВК БССР, пражывае ў горадзе Менску (Слуцкая выбарчая акруга).



Навіцкі Даніл Якаўлевіч, 1913 года нараджэння, член ВЛКСМ з 1931 года, лейтэнант-ордэнаносец Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, пражывае ў горадзе Оршы. (Аршанская выбарчая акруга).



Суганяка Нікалай Іосіфавіч—1902 года нараджэння, беспартыйны, калгаснік, старшыня калгаса імя Вароўскага, Дамановіцкага раёна. (Мазырская выбарчая акруга).

Іваноў Васілій Паўлавіч—1911 года нараджэння, член ВКП(б), настаўнік, працуе зараз дырэктарам школы медсясцёр у Быхаўскім раёне, пражывае ў гор. Быхаве (Рагачоўская выбарчая акруга).



Альтшулер Грыгорый Вульфавіч—1909 года нараджэння, беспартыйны, рабочы, стахановец, з 12-гадовым вытворчым стажам, пражывае ў горадзе Гомелі. (Гомельская сельская выбарчая акруга).

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ СОВЕТА

ЗАРЭГІСТРАВАНЫЯ АКРУГОВЫМІ ВЫБАРЧЫМІ КАМІСІЯМІ ПА ВЫБАРАХ

Лісунова Н'на Пятроўна—1914 г. нараджэння, спачуваючая ВКП(б), работніца-стаханаўка матальнага цэха фабрыкі штучнага валакна імя Куйбышэва. Пражывае ў горадзе Магілеве. (Магілеўская гарадская выбарчая акруга).



Кулагін Міхаіл Васільевіч, 1900 года нараджэння, член ВКП(б) з 1928 года, зараз выконваючы абавязкі старшыні слуцкага акрвыканкома. Пражывае ў гор. Слуцку. (Слуцкая гарадская выбарчая акруга).



Маркін Дзімітрый Фёдаравіч, 1899 года нараджэння, член ВКП(б) з 1924 года, па соцыяльнаму паходжанню рабочы, выконваючы абавязкі першага сакратара Мазырскага акругкома КП(б)Б (Мазырская гарадская выбарчая акруга).

Белкін Грыгорый Якаўлевіч, 1896 года нараджэння, прафесар, беспартыйны, вылучан кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей выкладчыкамі, студэнтамі і тэхперсаналам Мсціслаўскага педвучылішча і прадвыбарчай нарадай Горацкай выбарчай акругі. (Горацкая выбарчая акруга).

Астапаў Сямён Панцелеймонавіч—1896 года нараджэння, член ВКП(б) з 1932 года, інструктар—машыніст Гомельскага паравознага дэпо Беларускай чыгункі, пражывае ў мястэчку Насовічы, Церахоўскага раёна, БССР. (Гомельская сельская выбарчая акруга).



Власенкаў Кірыла Патапавіч, 1900 года нараджэння, беспартыйны, намеснік старшыні калгаса імя Варашылава, Віцебскага раёна, актыўны член Міхалеўскага сельсовета, выхадца з сям'і сялян-беднякоў. (Віцебская сельская выбарчая акруга).

НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР,

У СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ ПА ВЫБАРЧЫХ АКРУГАХ БССР

Еўменава Суклета Сілкаўна— 1898 года нараджэння, беспартыйная, стаханаўка, даярка калгаса „Завет Ільіча", Студзёніцкага сельсовета, Быхаўскага раёна (Быхаўская выбарчая акруга).



Фінагенаў Міхаіл Цімафеевіч, 1897 года нараджэння, член ВКП(б) з 1920 года, старшыня Гомельскага гарадскога Совета (Гомельская гарадская выбарчая акруга).

Шышкоў Васілій Фёдаравіч, 1900 года нараджэння, член ВКП(б) з 1925 года,—народны камісар земляробства БССР, пражывае ў горадзе Менску. (Аршанская сельская выбарчая акруга).

Мацюшэнка Архіп Іванавіч, 1908 года нараджэння, член КП(б)Б з 1932 года, селянін-калгаснік калгаса імя Дзержынскага, Ровена-Слабодскага сельсовета, Рэчыцкага раёна (Рэчыцкая выбарчая акруга).

Мельнікаў Сяргей Пятровіч, 1894 года нараджэння, член ВКП(б) з 1918 года, выконваючы абавязкі старшыні Лепельскага акр. выканкома (Лепельская выбарчая акруга).

Іваноў Александр Іванавіч, 1899 года нараджэння, член КП(б)Б, рабочы, вылучаны на пасаду намесніка дырэктара скурзавода імя Сталіна (Магілеўская сельская выбарчая акруга).

Усенародным лікаваннем адзначае шчаслівы

Таварыш Сталін робіць даклад аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР на Надзвычайным VIII Усесаюзным з'ездзе советаў

Адчуваю веліч Сталінскай Канстытуцыі

Я часта думаю, якая я шчаслівая, што жыву ў эпоху Сталінскай Канстытуцыі. Новая Сталінская Канстытуцыя, напісаная рукою мудрага правадыра народаў таварыша Сталіна, гэта заваяванае права на свабоднае, радаснае і шчаслівае жыццё.

Хто і ў якой краіне мае права на асвету, права на працу, права на адпачынак? У якой краіне жанчына карыстаецца аднолькавымі правамі з мужчынай? Нідзе ні ў адной краіне капіталістычнага свету працоўныя не маюць такіх правоў. Такія правы мае толькі 170-мільённы народ Вялікага Совецкага Саюза. Гэтыя правы залатымі літарамі запісаны ў новай Канстытуцыі.

Я—стаханаўка. Дзённую норму выконваю на 200 і больш проц., фізкультурніца. Значкіст СПХА, ГПА. У школе стаханаўцаў вучуся на „выдатна". У дзень гадавіны Сталінскай Канстытуцыі я ад імя ўсіх дзяўчат-стаханавак, ад імя ўсіх дзяўчат-фізкультурніц і значкістаў ад душы хачу выказаць шчырае дзякуй таму хто стварыў нам такое светла жыццё, хто так штодзённа кла поціцца аб нас—маладым пакаленні

12 снежня мы ўпершыню будзем галасаваць па новай Сталінскай Канстытуцыі. Я свой голас панясу за любімага наркома, блізкага жэйшага і вернага саратніка таварыша Сталіна, Клімента Ефрэмавіча Варашылава!

Менск.

Дора Палеева.

овецкі народ гадавіну Сталінскай Канстытуцыі!

Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае мацярынства!

Як хораша і цудоўна жыццё нашых старэйшых і маладых жанчын-мацярэй у эпоху Сталінскай Канстытуцыі.

Мы, адпачываючыя цяжарныя жанчыны ў доме адпачынку, як і ва ўсёй нашай краіне, штодзённа адчуваем сталінскія клопаты, любоў і павагу да нас—мацярэй.

Нас у доме адпачынку імя 11 ліпеня ў Ждановічах, цяжарных, 33 жанчыны.

Мы бязмежна шчаслівы тым, што з'яўляемся мацерамі нашай цудоўнай радзімы.

З велізарнай увагай і цікавасцю мы слухалі апавяданне тав. Мазур, стаханаўкі соўгаса, адпачываючай разам з намі, аб цяжкой горкай праўдзе мінулага жыцця жанчыны і маці. Яна расказала нам аб тым, што яе свякруха за сваё жыццё мела 18 цяжарнасцей. Яна раджала ў хлеве, на пасцілцы. Сама прымала нованароджанага, адносіла на печку, і хворая, ледзь рухаючыся па хаце, прымалася рыхтаваць бедную вячэру для сям'і, якая прыходзіла з работы ад памешчыкаў.

Сама тав. Мазур упершыню раджала ў 1918 годзе, калі ўся краіна палала агнём грамадзянскай вайны. Цяжка было тады раджаць у вёсцы без усялякай медычнай дапамогі і нават без бабкі. А калі нарадзіла, то назаўтра-ж ішла працаваць на сваю вузкую палоску і нованароджанага брала з сабой на поле. Там ён у калысцы пад кустом крычаў колькі мог.

Тав. Мазур са слязьмі радасці на вачах глядзіць на дарагую, родную, блізкую постаць таварыша Сталіна і гаворыць нам—маладым мацерам:

— Вы цяпер нараджаеце ў такіх добрых умовах як і я, збіраючаяся раджаць у сёмы раз. Хай гэта будзе сын ці дачка, я выхаваю адданае радзіме пакаленне.

Гэтае апавяданне, простае і сардэчнае, выклікала яшчэ большае пачуццё ўдзячнасці да совецкай улады, да нашай партыі і правадыра таварыша Сталіна за наша шчаслівае жыццё.

Мы ўдзячны за тое, што карыстаемся чатырохмесячным адпачынкам па цяжарнасці, за прыгожа абсталяваныя радзільныя дамы, за дзіцячыя яслі, сады і пляцоўкі, у якіх дзеці нашай прыгожай квітнеючай краіны атрымоўваюць узорнае выхаванне, дзе бязмежны дзяржаўныя клопаты аб дзецях і бацькоўская любоў Вялікага Сталіна.

Дом адпачынку дае нам усё неабходнае для таго, каб мы добра адпачылі, паправіліся, умацавалі сваё здароўе. Нашы спальні, нашы пакоі адпачынку абсталяваны як прыгожыя палацы. Наш адпачынак культурны, карысны. Мы атрымоўваем парады і кансультацыі урачоў.

Разам са сваёй краінай мы рыхтуемся да вялікага гістарычнага дня—выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Дзе-б мы не былі ў дзень 12 снежня: ці ў радзільным доме, ці дома, мы панясем свае бюлетэні ў выбарчыя ўрны за лепшых людзей нашай краіны. Тыя, хто з нас уваходзіць у Менскую выбарчую акругу, з вялікім гонарам і вялікай любоўю аддадуць свой голас за вернага саратніка таварыша Сталіна—любімага наркома абароны—першага маршала нашай доблеснай Чырвонай Арміі Клімента Ефрэмавіча Варашылава. У гэтую армію мы рыхтуем нашых дзяцей. І тых, каго мы народзім, мы абяцаем вырасціць комуністамі, большэвікамі, стойкімі патрыётамі соцыялістычнай радзімы.

Дзякуем таварышу Сталіну за шчаслівае мацярынства!

Л. С. Бравая, Р. Я. Каган, А. А. Чарнецкая, Т. М. Рамшэева, А. І. Хруцкая, Е. В. Пухарава, В. М. Міхневіч і інш.—усяго 33 подпісы.

Права на працу, на адпачынак, на асвету

Пятага снежня ўсенароднае ўсесаюзнае свята—гадавіна Сталінскай Канстытуцыі. І праз тыдзень мы, усе працоўныя Совецкага Саюза, пойдзем выбіраць вышэйшы орган улады—Вярхоўны Совет на аснове Сталінскай Канстытуцыі.

Сталінская Канстытуцыя мне дала ўсё.

Я жыву ў свабоднай краіне, гавару на сваёй роднай мове. Я маю права на працу. Мая праца ахоўваецца. Я працую толькі 7 гадзін у суткі. Раней у царскія часы рабочыя працавалі ад цямна да цямна, праца не аплачвалася. Эксплаататары плацілі столькі, каб рабочы не памірaў з голаду.

Я кожны год карыстаюся месячным адпачынкам. У 1936 годзе я была на курорце ў Кіславодску. Ніхто з рабочых у дарэволюцыйны час не мог ехаць адпачываць і лячыцца на курорт. Усё лепшае, усё прыгожае, усё тое, што магло ўзмацніць і прадоўжыць жыццё чалавеку,—усім гэтым раней карысталіся толькі багацеі-эксплаататары. Усім гэтым на аснове Сталінскай Канстытуцыі цяпер карыстаемся мы, працоўныя Совецкай краіны.

Ніхто раней не клапаціўся аб асвеце рабочага, ды і ён сам аб ёй марыць не мог, бо не меў ні сродкаў, ні часу, ён быў цёмны, забіты, галодны. Хіба рабочы мог вучыць сваіх дзяцей? Навука была даступна толькі для багатых і іх дзяцей.

А цяпер, на аснове Сталінскай Канстытуцыі, я маю права на асвету, і гэта права я з радасцю выкарыстоўваю. Я былая непісьменная хатняя работніца, цяпер слесар—стаханаўка, займаюся ў агульнаадукацыйнай школе для дарослых, жадаю вучыцца далей і магу гэтага свабодна дасягнуць. У Сталінскай Канстытуцыі запісана: „Грамадзяне СССР маюць права на асвету. Гэта права забяспечваецца ўсеагульнаабавязковай пачатковай асветай, бясплатнасцю асветы, уключаючы вышэйшую асвету, сістэмай дзяржаўных стыпендый".

Вялікае шчасце жыць у сталінскую эпоху, у эпоху Сталінскай Канстытуцыі. Штодзённа адчуваеш на сябе клопаты любімага Сталіна, усяго грамадства.

Я работніца-стаханаўка, але хачу працаваць яшчэ лепш, буду падымаць сваю вытворчасць працы, буду вучыцца, каб яшчэ больш быць карыснай нашай любімай краіне, дзе дзейнічае Сталінская Канстытуцыя, дзе Сталін нас вядзе па правільнаму ленінскаму шляху.

Да выбараў у Вярхоўны Совет падрыхтавалася добра. Добра вывучыла Палажэнне аб выбарах і Канстытуцыю. Хочацца чым найхутчэй панесці свой голас за лепшых людзей краіны, за любімага і роднага саратніка таварыща Сталіна—Кліма Ефрэмавіча Варашылава.

Паліна Пятроўна Бражнікава.

Менск, завод „Ударнік".

Светлы, чысты вобраз СЯРГЕЯ МІРОНЫЧА КІРАВА будзе жыць вякі, будзе звяць і будзіць шматмільённыя масы працоўных нашай радзімы і рэволюцыйных пролетарыяў усіх краін к нястомнай барацьбе за поўную і канчатковую перамогу комунізма.

ЯГО ІМЯ—СЦЯГ БАРАЦЬБЫ

Сёння працоўныя краіны соцыялізма абнажаюць голавы перад памяццю аднаго з лепшых сыноў і любімейшых правадыроў народа, палкага барацьбіта за комунізм Сяргея Міронавіча Кірава. Яго прыгожае, кіпучае жыццё было абарвана здрадніцкай куляй забойцы з подлай трацкісцка-зіноуеўскай зграі.

Сяргей Міронавіч Кіраў быў адданым барацьбітом партыі Леніна—Сталіна, якая выратавала нашу краіну ад пагібелі ў омуце імперыялізма і вывела яе на шырокі прастор соцыялістычнага росквіту. Ён быў плоць ад плоці той партыі, якая скінула ўладу капітала і запаліла нязгасны маяк соцыялізма на адной шостай частцы света. Ён быў бліжэйшым вучнем, саратнікам, другам таварыша Сталіна.

За трыццаць год самаадданай рэволюцыйнай работы Кіраў прайшоў шлях ад радавога байца да аднаго з любімых правадыроў партыі і народа. У рэволюцыйным падполлі, у царскіх казематах, пад градам белагвардзейскіх снарадаў, ля нафтавых вышак Баку, на заводах Ленінграда—усюды благародства яго сэрца, яснасць розума, прамата і непахіснасць характара, бліскучая даравітасць былі без астатка пастаўлены на службу велізарнейшай мэты, за якую калі-небудзь змагалася чалавецтва.

Яго акрыляла палкая вера ў пабудову соцыялізма у нашай краіне, у канчатковую перамогу комунізма. Яго кіпучая энергія паскарала і палягчала рух мас да соцыялізма. Яго непараўнальны талент арганізатара і кіраўніка, які аўладаў цудоўным дарам натхняць і паднімаць людзей, удзесяцераў іх сілы. Ён ведаў словы, ідучыя да самага сэрца народа. За контурамі велічнай будоўлі ён заўсёды бачыў жывых людзей. Сталінскімі клопатамі аб іх штодзённых патрэбах было поўна жыццё гэтага чалавека, бясконца блізкага і дарагога мільёнам. „Наш Міроныч“,—звалі яго рабочыя горада Леніна. Колькі цяплыні і любві ўкладалася ў гэтыя словы!

У адной з сваіх апошніх прамоў Сяргей Міронавіч гаварыў:

„Мы тут, на шостай частцы зямнога сухазем'я, бачым, як са дня ў дзень, з гадзіны ў гадзіну куецца новае, соцыялістычнае грамадства, будуецца сапраўды магутнае жыццё працоўных. І трэба быць сляпым, каб не бачыць, як цяпер **увесь зямны шар раскалоўся на два гіганцкіх, але няроўных паўшарый: на адным ноч, змрок і запусценне і мёртвае слова—смерць, на другім—жыццё, работа і творчасць і пераможнае слова—уперад да новага жыцця. І таварышы, няма людзей шчаслівей тых, якія называюцца большэвікамі. На гэтым паўшар'і мы з вамі нясем уперад гэты пераможны сцяг, і мы безумоўна пераможам, калі будзем адданы заветам Леніна, калі будзем следаваць указанням нашага любімага Сталіна**".

Кіраў паў у барацьбе двух светаў. Яго параніла куля, пасланая з аб'яднанага лагера Троцкага—Зіноўева—Гестапо. Адкіды рэволюцыі ўзненавідзелі Кірава за тое, што выклікала да яго гарачую любоў працоўных. Яго непрымірымасць да класавых ворагаў увасабляла барацьбу святла супроць цемры, розума супроць вар'яцтва, вернасці супроць здрадніцтва, гонару супроць подласці.

Выстрал у Кірава аддаўся набатным рэхам у сэрцах мільёнаў. Узросшая пільнасць да класавых ворагаў, пад якой-бы маскай яны не хавалі свае злачынныя планы, дапамагла разблытаць жудасныя сеткі здрадніцтва і двурушніцтва. Цяпер агідны малюнак беспрыкладных па сваёй подласці зладзействаў трацкісцска-зіноўеўскіх фашыстаў выяўлен перад усім светам. Ён сатканы з подлых забойц і шкодніцтва, з шпіянажа і дыверсанцкіх актаў. Гэтыя пасланцы з света цемры і смерці прагнулі забіць, узарваць, знішчыць, разбурыць. Яны марылі пазбавіць кіраўніцтва соцыялістычную рэволюцыю, разарваць на кавалкі і прадаць імперыялістам нашу радзіму, заліць краіну крывёю і слязьмі. І ўсё гэта ў імя адной мэты, настолькі-ж агіднай, наколькі безнадзейнай,—аднаўлення капіталізма ў нашай краіне.

„Няма больш шчаслівага часу, чым той, у якім мы з вамі жывем",—з гэтымі бадзёрымі і радаснымі словамі ішоў к масам Кіраў. „Мы пакажам рабочым вясёлае жыццё",—злосна шыпелі каты з трацкісцка-зіноўеўскай банды. Яны забілі Кірава, яны рыхтавалі замахі на таварыша Сталіна, на яго бліжэйшых саратнікаў. Яны зрабілі выбух на Кемераўскім рудніку ў Кузбасе, забівалі і калечылі лепшых стаханаўцаў-гарнякоў. Ці-ж гэты ланцуг зверскіх злачынстваў не змыкаецца непасрэдна з людаедаўскімі „подвігамі" фашыстаў у Іспаніі, паліваючых дажджом бомб безабароннае насельніцтва Мадрыда, цынічна знішчаючых жанчын і дзяцей?! Ці-ж тут не бачна адна і тая-ж каслявая лапа здыхаючага свету?!

Раздушыць гадзіну!—такі адзінамыслімы адказ на злачынствы трацкісцка-зіноўеўскіх мярзотнікаў. Так знішчаюць ядавітую змяю, якая прапаўзла ў жыллё чалавека. Тройчы праклятыя імёны гэтых людзей заклеймаваны каінавай пячаткай здрадніцтва, выкінуты на сметнік гісторыі. Яны сталі сінонімам агіднасці, перавышаючай усе ўзоры, вядомыя ў мінулым. І калі фашысцкія псы і свінні ўстаюць на абарону лазутчыкаў капіталістычнай рэстаўрацыі ў нашай краіне, то яны толькі выдаюць сваю агентуру з галавой. Іх падпявалы—рэакцыйныя лідэры Другога інтэрнацыянала, знайшоўшыя агідныя словы абароны забойцам Кірава,—выклікаюць пачуццё глыбокай нянавісці ва ўсіх чэсных людзей.

Няма той сілы ў свеце, якая магла-б павярнуць назад кола гісторыі! Але здыхаючы вораг імкнецца атруціць трупным ядам усё акаляючае. Вось чаму рэволюцыйная пільнасць па ранейшаму застаецца тым заветам, які павінен быць асабліва памятны кожнаму комуністу, кожнаму совецкаму грамадзяніну.

У апошнія месяцы свайго жыцця Сяргей Міронавіч Кіраў гаварыў: „У бліжэйшыя два-тры гады другой пяцігодкі разгарнуцца ў нашай вялікай краіне і асабліва ў сельскай гаспадарцы такія гіганцкія новыя вытворчыя сілы, якіх яшчэ ніколі не бачыў свет. Наша пабеданосная соцыялістычнае будаўніцтва ідзе поўным ходам, ідзе грамавым усепадымаючым маршам уперад.

Усё больш дзівосныя плады дае багатая глеба нашай роднай краіны, узрыхленая тытанічным плугам пролетарскай рэволюцыі. Перамогшы соцыялізм магутнай рукой падымае да творчага поўнакаштоўнага жыцця ўсё новыя і новыя пласты працоўных. Сярод фашысцкага вандалізма, сярод нікчэмных абломкаў буржуазнай дэмакратыі горда развіваецца сцяг совецкага соцыялістычнага дэмакратызма. Грамавы, усепадымаючы марш новага свету ніколі яшчэ не быў так велічны, як у нашы дні".

З глыбокім хваляваннем слухаў VIII Усесаюзны З'езд Советаў і ўвесь совецкі народ словы таварыша Сталіна аб тым, што: „... кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарма, яна дала свае вынікі". І кожны ўспамінаў пры гэтым аб дорагакаштоўнай кіраўскай крыві, пралітай за справу соцыялізма, за светлы і радасны свет вызваленай працы. Пройдуць вякі, але ў свядомасці надыходзячых пакаленняў будзе вечна жыць авеяны славай і любоўю народнай незабыўны вобраз беззаветнага, крыстальва чыстага барацьбіта той вялікай эпохі, калі ў барацьбе двух светаў рашаўся лёс чалавецтва,—вобраз палкага трыбуна соцыялістычнай рэволюцыі—Сяргея Міронавіча Кірава.

(„Правда"). 11

Лепшых дачок нашай радзімы—

СОФІЯ ПЯТРОЎНА РАЧОК

Жыццёвы шлях Зоні Рачок—гэта шлях сотняў, тысяч дзяўчат нашай соцыялістычнай краіны, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна. Ад забітай, беднай сіраты да знатнага чалавека краіны—вось шлях Зоні Рачок. Цяжкія гады прышлося перажыць Зоні. З малых год пайшла яна працаваць на багацеяў і кулакоў. Часта галодная, не маючая прытулка і сродкаў да існавання, Зоня маленькай дзяўчынкай прымушана была цярпець здзекі. Сама яна часта ўспамінае і расказвае вось што:

— Працавала я ад цямна да цямна. Працавала многа, не пад сілу, а хлеба амаль ніколі не ела даволі. А самае галоўнае, не глядзелі на мяне, як на чалавека, а як на працоўную жывёлу. Калі ўжо падрасла, бывала, на вечарынках не запрашалі мяне танцаваць, адварачваліся. Вельмі часта думала я, чым я горш другіх, але адказу не знаходзіла. Толькі моцную нянавісць затойвала ў сваім сэрцы супроць тых, хто не хацеў глядзець на мяне.

Многа год блукання па чужых людзях загартавалі Зоню, выпрацавалі ў яе цвёрды, настойлівы характар.

* * *

У 1929 годзе Зоня ўступае ў калгас „Колас“, Бабаўнянскага сельсовета. Тут яна знайшла сабе сям'ю, таварышоў і сваё сапраўднае жыццё. Яна аддана пачала працаваць на калгасных палях, была лепшай ударніцай калгаса.

1930 год. На Копыльшчыне арганізавалася машына-трактарная станцыя. Першы раз у сваім жыцці бачыла Зоня трактар. Узнікла вялікае жаданне працаваць на гэтай машыне. Але як гэта зрабіць зусім непісьменнай дзяўчыне? Не адкладаючы справу надоўга, яна ўпарта пачала вучыцца грамаце, каб, навучыўшыся чытаць і пісаць, пачаць вывучаць тэхніку.

У студзені 1931 года праўленне калгаса вылучае Зоню на курсы трактарыстаў як лепшую ўдарніцу калгаса. Вельмі ўзрадавалася Зоня. Мары яе збыліся—яна на курсах па вывучэнню трактара. Заканчвае іх на „выдатна“.

Колькі было радасці, калі Зоня ўпершыню села на трактар! У першы-ж год Зоня паказала сябе як лепшая трактарыстка-ўдарніца. За ўдарную работу дырэкцыя

МТС прэміруе яе экскурсіяй па СССР. Многа дзе пабыла Зоня. Гэта расшырыла яе кругазор.

Ужо праз год адданую трактарыстку Зоню вызначаюць брыгадзірам трактарнай брыгады. Брыгада яе заўсёды перадавая. Шэсць год працуе тав. Рачок брыгадзірам трактарнай брыгады. На працягу гэтага часу яна паказала сябе як лепшы брыгадзір-стаханавец, добры арганізатар і чулы таварыш.

* * *

У снежні 1934 года раённы з'езд Советаў Капыльшчыны за выдатную работу абраў Зоню Рачок дэлегатам Усебеларускага З'езда Советаў. Тут яе абіраюць членам прэзідыума ЦВК БССР і дэлегатам VII Усесаюзнага З'езда Советаў. Не верылася Зоні, што яна дэлегат Усесаюзнага з'езда, што яна ўбачыць самага дарагога ёй чалавека—таварыша Сталіна. Але гэта было так. Яна сапраўды ўбачыла Сталіна, чула прамовы кіраўнікоў партыі і ўрада, і гэта яе натхніла працаваць яшчэ больш, яшчэ лепш.

З Масквы Зоня Рачок прыехала членам Саюзнага ўрада. Яна цвёрда рашыла апраўдаць гэта пачэснае званне. З яшчэ большым захапленнем узялася за работу.

Гордая за сваю брыгаду, за выкананне ўзятых абавязкаў, едзе Зоня ў Маскву на Усесаюзную нараду перадавікоў ураджайнасці. Тут яна пачула, што Паша Ангеліна выпрацавала больш 1 000 гектараў на трактар. Зоня цвёрда рашае не адстаць ад Пашы Ангелінай. На 1936 год бярэ абавязак даць 1100 гектараў, і гэты абавязак з гонарам выконвае.

Праз газету „Звязда“ яна звярачваецца да ўсіх трактарыстаў БССР з прапановай даць на кожны трактар „ХТЗ“ не менш 400 гектараў. Трактарысты рэспублікі яе падтрымліваюць. Пачынаецца ўсебеларускае спаборніцтва трактарыстаў.

Зоня Рачок—дэлегат XII Усебеларускага з'езда Советаў, удзельнік VIII Надзвычайнага З'езда Советаў. Разам з іншымі абраннікамі совецкага народа зацвярджае Сталінскую Канстытуцыю—самую дэмакратычную ў свеце.

Так былая, забітая, непісьменная Зоня Рачок, акружаная клопатамі партыі Леніна—Сталіна, стала знатным чалавекам.

Выбаршчыкі Слуцкай акругі вылучылі яе кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета і на прадстаячых выбарах аддадуць свае галасы адной з лепшых стаханавак соцыялістычных палёў, выхаванай партыяй і совецкай уладай—Зоні Рачок.

Пятроўская.

У Вярхоўны Совет СССР

ЕКАЦЕРЫНА СЯРГЕЕЎНА ЖУРАНКОВА

Было гэта даўно—восем год таму назад. У Барысаве выраслa вялікая прыгожая запалкавая фабрыка. Разам з іншымі работніцамі прышла з вёскі Глівіна Каця Журанкова. Каця, увайшоўшы ў цэх, са здзіўленнем разглядала, як металічныя часткі, рычагі з пружынавымі калёсікамі хутка і рытмічна рухаліся, як па камандзе выкідвалі акуратна зробленыя каробкі. Усё было цікава і нова вясковай дзяўчыне.

Ішлі гады. Каця упартай працай аўладала складанай машынай, стала лепшай ударніцай.

Паваротным пунктам у жыцці Каці, як яна сама кажа, быў 1932 год. У гэты год Кацю прынялі, як лепшую работніцу-ударніцу, энтузіястку соцыялістычнай працы, у рады комуністычнай партыі. З гэтага часу Журанкова няўхільна ідзе па шляху палітычнага росту. Яна дасканала і напорыста вывучае гісторыю партыі, паднімае свой агульнаадукацыйны ўзровень.

Грукаты адбойнага малатка Аляксея Стаханава дакаціліся ў цэхі запалкавай фабрыкі. Каця яшчэ з большым энтузіязмам бярэцца за працу, і не толькі сама паказвае ўзоры стаханаўскай работы, але ўмела і разумна арганізоўвае стаханаўскую брыгаду.

Кацю паважаюць усе работніцы за яе чуласць да запатрабаванняў кожнай работніцы, за яе ўменне арганізаваць працу, за адданасць да працы, за скромнасць.

Вось што расказвае яе сяброўка па працы Дуня Казак:

— Захварэла я аднойчы, завезлі ў больніцу. Першай да мяне прышла Каця: „Дунечка, што табе патрэбна?“ І кожны дзень яна мяне наведвала, нават калі працавала ў трэцяй змене.

Не толькі як добрая работніца, чулы таварыш, лепшая стаханаўка вядома Каця Журанкова рабочаму калектыву запалкавай фабрыкі імя Кірава. Яе тут ведаюць як добрага арганізатара, як стойкага і непахіснага комуніста, адданага справе Леніна—Сталіна да канца, яе ведаюць як чалавека, у якога словы не разыходзяцца са справай.

Журанкова, прышоўшы на фабрыку непісьменнай дзяўчынай, стала пісьменнай. Зараз займаецца на другім курсе раённай соўпартшколы. Партыйныя даручэнні заўсёды выконвае добрасумленна.

Каця Журанкова—член парткома на фабрыцы, член раённага камітэта КП(б)Б, дэлегатка XVI з'езда КП(б)Б. Ужо тры месяца, Каця працуе майстрам змены. На гэту пасаду яе вылучылі як лепшую стаханаўку. Умелай арганізацыяй працы яна дабілася, што змена стала перадавой на фабрыцы не толькі па выкананню промфінплана, але і па пастаноўцы масавай работы, па актыўнасці ў грамадскім жыцці.

І калі тысячны калектыў запалкавай фабрыкі імя Кірава сабраўся на прадвыбарчы сход, каб абмеркаваць і намеціць кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета, аднадушна была намечана кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Екацерына Сяргееўна Журанкова. Адна за адной выступалі работніцы, расказваючы аб сваёй Каці, але лепш усіх слоў выступаючых былі справы Журанковай, яны за яе гаварылі.

Кандыдатуру Екацерыны Сяргееўны горача падтрымалі рабочыя, калгаснікі і служачыя Барысаўскай гарадской выбарчай акругі.

На адбыўшымся паседжанні акруговай выбарчай камісіі Екацерына Сяргееўна зарэгістравана кандыдатам у дэпутаты ў Совет Нацыянальнасцей ад гарадской выбарчай акругі.

Барысаў.

І. Іваноў

ВЫБЕРАМ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР ПАЛКІХ ПАТРЫЁТАЎ НАШАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАДЗІМЫ, БЕЗЗАВЕТНА АДДАНЫХ ВЯЛІКАЙ СПРАВЕ ЛЕНІНА—СТАЛІНА!

Лепшых дачок нашай радзімы—

Ніна Пятроўна Лісунова

У жабрацкай сям'і рабочага Магілёўскага цагельнага завода Лісунова Пятра нарадзілася першае дзіцё. Не надта радаваліся гэтай падзеі бацькі, таму што гэты год быў цяжкім. Гэта быў 1914 год. Сям'я Пятра Лісунова да рэволюцыі ўвесь час жыла ўпрогаладзь. Лісуноў, працуючы на заводзе па 14 гадзін у суткі, не разгінаючы спіны, зарабляў нікчэмныя грашы.

Так расла і выхоўвалася да рэволюцыі маленькая Ніна.

* * *

... У 1930 годзе 16-гадовай дзяўчынай прышла Ніна Лісунова на Магілеўскую фабрыку штучнага валакна. Аддзел кадраў накіраваў яе ў склад на распакоўку дэталей. З першых дзён работы гэта простая сарамлівая дзяўчына сваёй работай звярнула на сябе ўвагу старшых таварышоў. Сваёй стараннай і добрасумленнай працай яна завяявала назву ўдарніцы. Яе вопыт работы сталі вывучаць другія работніцы фабрыкі

З таго часу прайшло 7 год. Тэрмін не такі ўжо вялікі. Але змены, якія адбыліся ў жыцці Ніны, вялікія. Ніна Лісунова стала зусім новым чалавекам, зусім не падобнай на тую, якой яна прышла на фабрыку.

Зараз Ніна Лісунова—лепшая стаханаўка матальшчыца. Пачэсную назву стаханаўкі, заслужаную соцыялістычнай працай, яна трымае другі год. З кожным месяцам яна павялічвае прадукцыйнасць працы, а разам з гэтым павялічваецца і заработная плата. Ніна атрымоўвае ў месяц у 12 раз больш, чым атрымоўвалі яе бацькі да рэволюцыі.

Непазнавальным стала жыццё Ніны Лісуновай. Вось што расказвае аб сваім мінулым і сучасным жыцці яна сама.

— Гляджу я на сябе зараз і дзіву даюся. Якія змены адбыліся за гэтыя сем год! Сама сябе не пазнаю. Да, жыццё маё не параўнаць з жыццём маіх бацькоў.

Ніна ў 1932 годзе скончыла фабзавуч.

— Навучыўшыся, як след, працаваць,—гаворыць Ніна,—я цвёрда рашыла, што норму 410 маткоў можна значна перакрыць. Калі пачаўся стаханаўскі рух, я першай перайшла на дзве старонкі. Стала больш уважліва працаваць, эканоміць свае рухі, каб не бегаць без толку каля машыны. Гэта павысіла выпрацоўку. Я пачала даваць 650—700 маткоў за змену.

Ніна цвёрда рашыла перакрыць і гэтую норму. Уключыўшыся ў прадкастрычніцкае спаборніцтва, яна вышла ў ім пераможцай, заваявала пяршынства. За змену яна дабілася рэкорднай выпрацоўкі—950 маткоў пры самым мінімальным браку.

З ростам фабрыкі выраслі і новыя людзі. Ніна Лісунова выросла на фабрыцы не толькі як добрая работніца-стаханаўка, але і як добры арганізатар. Каля трох год яна працуе брыгадным прафоргам. У мінулым годзе Лісунова ўступіла ў групу спачуваючых комуністычнай партыі.

Зараз Ніна Лісунова вядома не толькі Магілеўскаму раёну, як лепшая стаханаўка—патрыёт нашай вялікай радзімы, яна вядома ўсяму Совецкаму Саюзу. Гэта яна—Лісунова Ніна Пятроўна выступае на шматлікіх сходах выбаршчыкаў на прадпрыемствах і ўстановах. Гэта яна зарэгістравана Магілеўскай выбарчай акругай кандыдатам у дэпутаты ў Совет Нацыянальнасцей.

У нашай шчаслівай краіне, кіруемай вялікай партыяй Леніна—Сталіна, растуць новыя людзі, людзі сталінскай эпохі. За іх мы і аддаем свае галасы.

А. Караткевіч.

Выступленне т. Лісуновай на вечары сустрэчы з маладымі выбаршчыкамі. (Белсаюзфота.)

У вярхоўны Совет СССР.

Еўдакія Несцераўна Мінава

Хутка імчыцца легкавая машына. У ёй—Еўдакія Несцераўна Мінава. Яна едзе на акруговую прадвыбарную нараду. Еўдакіі міжвольна ўспамінаюцца малюнкі з пражытага жыцця.

... Вось яна бачыць згніўшую хацінку свайго бацькі Несцера Бацюшкава, былую беднасць, вось уся сям'я іх развітваецца са старэйшымі сёстрамі, якія ідуць у Сібір шукаць лепшага лёсу. А цяпер іх няма у жывых,—у пакутах і памерлі.

... Усе яны абкружылі бацьку, які дрыжачым голасам чытае пісьмо з фронта: „Фёдара забілі". Раптам, як жывы, устае перад вачыма старэйшы брат Сідар—партызан, якога белапалякі павесілі на Полаччыне. На яго ілбу каты выразалі звязду.

... 1935 год. Яна на Усесаюзным з'ездзе Советаў. Яе абіраюць членам ЦВК СССР. Жанчына, што сядзела радам, нахілілася і шэпча на вуха: „Не плач, супакойся, Еўдакія. Ты паглядзі кругом, колькі рук узнята ўгору. Гэта-ж за цябе галасуюць. Будзеш членам саюзнага ўрада". Слёзы ішлі ад глыбіні душы за радасць, за шчасце.

... VIII Надзвычайны З'езд. Яна сядзіць у прэзідыуме сярод правадыроў партыі і ўраду. Вось яе фатаграфуюць разам з таварышам Сталіным і тав. Калініным.

... Сход у калгасе імя Ежова. Усе выбаршчыкі аднадушна заяўляюць: „Мы абярэм Мінаву ў Совет Нацыянальнасцей. Гэта-ж наша лепшая стаханаўка. Лепшая звеннявая, лепшы старшыня калгаса. Памятаеце, як ёй прыходзілася ў 1921 годзе ваяваць за гэты калгас. Яе мы будзем выбіраць у вярхоўныя органы ўлады. Яна ўжо даказала, што і жанчына можа кіраваць дзяржавай".

Многія сходы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў Рагачоўскага і Жлобінскага раёнаў аднадушна падтрымалі кандыдатуру Еўдакіі Несцераўны. Многія выбаршчыкі выступалі на сваіх выбарчых сходах і гаварылі, што яе ведаюць, як дачку беззямельнага селяніна, якая сапраўднае, новае радаснае жыццё адчула толькі пры совецкай уладзе. У 1921 годзе, калі на памешчыцкіх землях арганізавалася сельскагаспадарчая арцель. Мінава

першая са сваёй сям'ёй уступіла ў яе. З першых дзён яна з запалам змагалася за ўмацаванне калгаса, выкрывала ворагаў, якія сваімі шкодніцкімі дзеяннямі хацелі падарваць калгасны лад. Працавала пераважна ў палявой брыгадзе, звеннявой была. Яе звяно заўсёды з'яўлялася перадавым. За добрасумленныя адносіны да работы, за ўпартую работу над сабой тав. Мінаву часта прэміруюць.

У 1935 годзе, як лепшую ўдарніцу калгаса, звеннявую, як актыўную прапагандыстку за перабудову сельскай гаспадаркі, Еўдакію Несцераўну выбіраюць старшынёй калгаса імя Ежова. За два гады сваёй ударнай работы Еўдакія Несцераўна вывяла адсталы калгас ў перадавыя. Калгас імя Ежова, якім кіравала Еўдакія Несцерава, у гэтым годзе першым у раёне справіўся з уборкай усіх культур, з пасевам азімых, першы разлічыўся з дзяржавай па ўсіх відах паставак. Калгаснікі атрымалі на працадзень па 8 кілограмаў бульбы і па 2,5 кілограма зернавых. Многія сем'і маюць па 2,5 тоны хлеба. За добрае кіраўніцтва калгасам раённы камітэт партыі прэміраваў тав. Мінаву пуцёўкай на курорт. Як лепшага старшыню калгаса, як аддаднага беспартыйнага большэвіка і змагара за справу Леніна-Сталіна насельніцтва Побалаўскага сельсовета ў кастрычніку месяцы выбрала Мінаву старшынёй свайго сельсовета, дзе яна працуе і зараз.

Мала тав. Мінавай прыходзілася гаварыць на сходах самой. Аб ёй гаварылі. Гаварылі, як аб вядомым чалавеку, блізкім, сваім чалавеку.

Тав. Мінава дала згоду балатыравацца па Жлобінскай выбарчай акрузе, якая і зарэгістравала яе, як свайго кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей.

Старавойтава

Партыя Леніна—Сталіна вырасціла сотні і тысячы лепшых людзей, здольных быць кіраўнікамі першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян.

АБ ЦЯЖКІМ МІНУЛЫМ

(Апавяданне стаханаўкі Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі „КІМ“ тав. Мудрынскай)

Першыя гады першай пяцігодкі. На ўскраінах Віцебска нараджаліся гіганты са слаўнай сям'і „518“. З усіх бакоў рушыліся падводы, нагружаныя цэментам, цэглай, жалезам, шклом. Над морам пахілых хат падымаліся паступова стройныя квадраты вялізных будынкаў. На Гутараўшчыне вырасталі шматпавярховыя карпусы фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі“ і шчаціннага камбіната. А на Маркаўшчыне такія-ж шматпавярховыя карпусы алейнага завода і фабрыкі „КІМ“.

Найбольш за ўсё мяне цікавіла будаўніцтва фабрыкі „КІМ“, бо жыццё маё з маленства звязана з вырабам панчох. Дзесяцігадовай дзяўчынкай я пачала набываць кваліфікацыю панчошніцы. У 1920 годзе памёрла мая маці. Пасля яе засталося сем душ дзяцей, і я самая маленькая. Старшая сястра аддала малодшую ў людзі. Прытуліў мяне „добры“ гаспадар і „паважаны“ чалавек з-пад Высачан Халімон Туз. Як цяпер памятаю хутар, агароджаны высокім плотам. У аборах з каменным падмуркам стаяла восем дойных кароў, сытыя яны лянівa пераможвалі жвачку. Непакойна рыкалі крутарогія бугаі.

Халімон Туз не любіў, каб капейка ляжала без руху. Калі пачалі падрастаць яго дочкі, ён агарадзіў кут прасторнай хаты, абсталяваў за перагародкай панчошную майстэрню і, задаволена ўсміхаючыся, сказаў:

— Ну, красуні мае, збірайце маім дачкам і сабе на пасаг. Святы Юры вам дапаможа.

У майстэрні акрамя мяне працавалі яшчэ чатыры дзяўчынкі. Увосень і ўзімку яшчэ крыху можна было трываць, бо гаспадар шкадаваў газы для вячэрняй працы. Надышла вясна, а за ёй і лета. Дні рабіліся ўсё даўжэйшымі. У майстэрні душна. Роем насіліся мухі. Тузы яшчэ з вечара, гледзячы на неба, гадалі аб тым, якое заўтра будзе надвор'е. І рабілася страшна, калі, адбіўшы паклоны перад вобразам, на якім гарцаваў боскі коннік з казацкай пікай, кулак гаварыў:

— Ну, дзеткі мае, кладзіцеся спакойна спаць. Дзякуй богу заўтра надвор'е будзе добрае. Пэўна святы Юры любіць малых панчошніц.

Для нас гэта значыла, што заўтра трэба ўстаць яшчэ на золаку і працаваць у майстэрні, пакуль сонца высушыць росы. Пакуль узыходзіла сонца і высыхала раса, рукі пачыналі млець, усё цела агортвала змора, але адпачываць нельга. Мы ішлі на поле прыбіраць скошанае сена. Часам сярод яснага неба ўсплывалі хмары, ліўся дождж і тады дзяўчаты зноў ішлі ў майстэрню вязаць панчохі. Мы не ведалі адпачынку ні ў дрэннае ні ў добрае надвор'е. Але мне яшчэ зайздросцілі дзяўчаты, што працавалі ў суседніх майстэрнях.

— Табе добра, у твайго гаспадара няма малых дзяцей.

Як толькі навучылася рабіць панчохі, кінула кулака і накіравалася ў горад. Тут спачатку працавала ў капіталіста Ормана, а калі пасля пры дапамозе сястры купіла машыну—пачала працаваць дома.

Нібы цяпер бачу хлуслівую рэкламу лодзінскай фірмы, у якой купіла машыну: гладкая паненка, ветліва ўсміхаючыся, круціць ручку флангавай машыны і ў вялізную панчоху, як зерне ў мех, сыплюцца адна за адной залатыя манеты.

„Гарантаваны сродак зрабіцца багатым“ напісана пад малюнкам. Якая хлусня! Ніколі я не бачыла раней гладкіх, вясёлых і багатых панчошніц. Ніколі я не мела за сваю работу залатых манет. Яны сыпаліся ў кішэні Туза і Ормана, ад якога я залежыла і купіўшы машыну. Орман, аблічваючы пры кожным зручным выпадку, даваў мне ніткі і прымаў панчохі.

* * *

У адзін светлы дзень, вычысціўшы сваю машыну так, што яна ззяла на сонцы, я ўзяла яе пяшчотна на рукі, завярнула ў чысты абрус і панесла на панчошную фабрыку імя Клары Цэткін. У маленькім пакойчыку былога „дваранскага сабранія“ змясціўся наш цэх. Працавала ў ім дваццаць работніц. Адсюль пачалося маё сённешняе жыццё, так непадобнае да ўчорашняга.

У 1930 годзе мяне, як лепшага інструктара матальнага цэха, вылучылі на курсы па павышэнню кваліфікацыі. Рыхтаваліся кадры для новай трыкатажнай фабрыкі. Я не ведала, дзе мая старая машына і не шкадавала аб гэтым. Усю ўвагу захапілі складаныя машыны — вязальныя аўтаматы. Па сканчэнню курсаў мяне накіравалі на новую фабрыку. Ішла ўстаноўка машын, а разам з ёю пачалася перакоўка людзей. З вёсак, з мястэчак прыходзілі людзі, пераважна дзяўчаты. Яны ніколі не працавалі на фабрыцы. Машыны навічкоў пужалі. Я павінна была навучыць іх працаваць. Гэта было ўвосені 1931 г. Мне асабліва памятны гэты год, бо ў ім я ўступіла ў комуністычную партыю.

У апошні час я вылучана начальнікам змены.

Сёлета глядзела ў тэатры „Платон Крэчэт“. Памятаеце, як герой п'есы—хірург Крэчэт у гутарцы са старшынёй райвыканкома прыводзіць статыстыку былой царскай Расіі, дзе працягласць жыцця мужчыны раўнялася трыццаці пяці гадам, а жанчыны трыццаці гадам.

Мне здавалася, што ён гаворыць маімі вуснамі аб маіх бацьках, але не аба мне—жанчыне, якая не адчувае старасці, шчаслівай жанчыне Вялікага Совецкага Саюза.

Фашысцкі тэрор, жабрацтва, беспрацоўе—вось лёс працоўных у краінах капіталізма!

Свабоднае, заможнае жыццё для працоўных—вось вынік нашай Кастрычніцкай рэволюцыі!

ДОГЛЯД ЗА ГРУДНЫМ ДЗІЦЁМ

Пакой, дзе знаходзіцца грудное дзіця, павінен быць прасторным, сухім, цёплым і па магчымасці сонечным. Праветрываць яго, адчыняючы фортачкі, трэба раніцой ці вечарам і на гэты час выносіць дзіцё з пакоя ці паставіць ложак так, каб халоднае паветра не пападала на дзіця. Тэмпература пакоя павінна быць 17—18 градусаў па Цэльсію. Не патрэбна заграмаджаць пакой мэбляй.

Дзіця трэба выносіць на паветра нават зімой, пачынаючы з трохтыднёвага ўзросту. Але пры ветры час прагулкі патрэбна скарачаць. Гуляць з дзіцём патрэбна на сонечным баку. Апранаць яго для прагулкі цёпла, але так, каб пры звароце да дому ён не быў потным. Лепшы час для прагулкі—ад 10 да 11 гадзін раніцы і ад 1 да 3 гадзін дня. Зімой дзіця патрэбна трымаць на сонцы магчыма больш. Летам награванне на сонцы дзіцяці шкодна. Летам дзіця павінна праводзіць на паветры ўвесь дзень—з раніцы да вечара. Добрымі для дзіцяці з'яўляюцца „паветраныя ванны": разы два ў дзень яго трэба пакідаць ляжаць голенькім, вядома, у цёплым пакоі, а летам на паветры.

Для дзіцяці абавязкова мець асобны ложак з пляцёнай сеткай з шнуркоў па бакавых сценках. Ложак павінен быць нерухомы і стаяць не ўздоўж сцяны, а ўзгалоўем да яе, каб доступ паветра дзіцяці быў забяспечан з усіх бакоў. Матрацік лепш за ўсё набіваць марской травой, мачалай, але можна набіваць і саломай. Падушка павінна быць тонкай і не вельмі мяккай.

Бялізна грудного дзіцяці робіцца з папяровай мяккай матэрыі, кофтачкі і цёплыя пялёнкі—з мультаны ці фланелі. Свабодная распашонка завязваецца ўперадзе. Наверх распашонкі надзяваецца кофтачка (таксама з завязкамі—без гузікаў і зашпілек). Падсушваць пялёнкі і зноў карыстацца імі непатрэбна. Закручваецца дзіця ў пялёнкі толькі да падмышак, каб ручкі заставаліся свабоднымі. Спавіваць яго патрэбна так, каб не сцясняць рухаў, не парушаць крывяабарэту, не затрудняць дыхання і не перашкаджаць свабоднаму выпарэнню з паверхні скуры.

Бялізну дзіцяці патрэбна мыць і гатаваць асобна ад бялізны дарослых і добра яго прапрасоўваць.

Усе складкі скуры дзіцяці патрэбна штодзённа старанна абглядаць, не дапускаць, каб дзіця ляжала ў мокрых пялёнках. Пасля кожнага мачаспускання і выпаражнення патрэбна падмываць дзіця цёплай гатаванай вадой. Дзяўчынак патрэбна падмываць ад палавога органа к заднему праходу, каб не ўнесці ў яго забруднення. У ложку дзіця патрэбна паварачваць на той ці другі бок.

Купаць дзіця да шасці месяцаў патрэбна штодзённа, потым—праз дзень, і пасля году—адзін-два разы ў тыдзень. Лепш купаць увечары, перад сном, а летам і днём. У лазню насіць яго не трэба. Купаць дзіця лепш у ванне, але можна купаць яго і ў карыце, якое не ўжываецца для мыцця бялізны. Купаць не больш 5 мінут, з тэмпературай вады 35 градусаў па Цэльсію. Апускаць яго ў ванну, падтрымліваючы спінку левай рукой, на прадплеччы якой ляжыць галава дзіцяці. Мыюць дзіця правай рукой, пачынаючы з галавы. Мыць яго патрэбна мяккай анучкай, ватай, марляй ці проста намыленай рукой. Абліўшы дзіця са жбана вадой, градусаў на два халаднейвады ў ванне, абсушыць яго прасціной, прыкладваючы яе да цела, але не выціраючы, бо гэта лёгка пашкоджвае скуру дзіцяці. Старанна патрэбна высушваць скуру на зморшчынах: за вушамі, на шыі ўперадзе, пад мышкамі, у пахах—потым гэтыя месцы прыпудрываць талькам і выкінуць гэту ватку.

Твар дзіцяці ў ванне не мыць, а пасля купання абціраць вадой або слабым растворам борнай кіслаты. (Чайная лыжка на стакан вады). Кожнае вока абціраць асобным кавалачкам ваты. Нос і вушы прачышчаюцца па меры патрэбнасці кавалачкамі стэрыльнай ваты, скручанымі жгуцікамі, змазанымі вазалінам. Нельга прачышчаць нос ваткай, накручанай на запалку або шпільку, бо лёгка пашкодзіць носік і вушы дзіцяці.

Лепшае харчаванне для дзіцяці—натуральнае кармленне груддзю маці. Карміць трэба праз пэўны прамежак часу. У першы раз нованароджаны прыкладаецца да грудзі праз 6 гадзін, потым кожныя 3 гадзіны—7 разоў у суткі. Правільнае кармленне мае вялікае значэнне для лёсу неданошанага дзіцяці. Кормяць іх праз 2 гадзіны—10 разоў у суткі з перапынкам ад 12 гадзін начы да 6 гадзін раніцы.

Перад кожным кармленнем маці павінна мыць рукі, абціраць грудзь перад і пасля кармлення ваткай, змочанай кіпячонай вадой або растворам борнай кіслаты.

Першыя некалькі кропель малака сцэджваюцца для ўдалення выпадковага забруднення. Дзіцяці патрэбна даваць у рот такім чынам, каб ён захапіў і частку калясасковага кружка. Сасок ад гэтага менш пашкоджваецца і радзей бываюць трэшчыны. Працяжнасць кармлення нованароджанага, калі ён яшчэ не ўпаўне прыстасаваўся, 20—30 мінут. Потым працяжнасць яго скарачаецца да 15—20 мінут.

Пры кармленні дзіцяці груддзю патрэбна ставіць пад ногі кормячай маленькую скамеечку і сачыць, каб насавое дыханне дзіцяці не затруднялася мацінай груддзю. Для гэтага патрэбна прытрымліваць грудзь свабоднай рукой, злёгку сціскаючы яе. Калі дзіцяці недастаткова высасваемага малака, патрэбна звярнуцца ў дзіцячую кансультацыю, дзе можна атрымаць па парадзе доктара дакорм ў форме розных мешанін.

Самыя падыходзячыя цацкі для грудного ўзросту гумавыя і цэлулоідныя. Іх можна дэзінфікаваць. Цацкі важны тым, што прывучаюць дзіця к рухам і развіваюць мускулы верхніх канечнасцей.

Дацэнт Свярдлоўскага акушорскага інстытута
А. Багданава.

Адказны рэдактар Ц. Б. ФРЫД.

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-070, 24-058.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1796. Тыраж 7.270 экз. Уп. Галоўлітбела № 3282.
Здана ў набор 21/XI—37 г. Падпісана да друку 1/XII—37 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.

ЦАНА 20 кап.

Работніцы і калгасніцы, жонкі рабочых і служачых!

088

Падпісвайцеся і чытайце свой журнал

„Работніца і калгасніца Беларусі"

Выданне ЦК КП(б)Б

Журнал выходзіць два разы ў месяц з дадаткам— выкрайкай жаночага і дзіцячага адзення і вышыўкі.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

на 1 мес.—40 кап.	на 6 мес.—2 р. 40 кап.
на 3 мес.—1 р. 20 кап.	на год—4 р. 80 кап.